ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
31 кастрычніка 2015 г. № 913

# Аб правядзенні навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці»

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Правесці з 10 снежня 2015 г. па 10 студзеня 2016 г. навагоднюю дабрачынную акцыю «Нашы дзеці» з удзелам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іншых мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

2. Кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў асабіста прыняць удзел у навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», наведаць дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, апякунскія і прыёмныя сем’і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, сем’і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, дзіцячыя бальніцы з мэтай віншавання дзяцей з Новым годам, Нараджэннем Хрыстовым, уручэння ім падарункаў, аказання дапамогі ў вырашэнні ў адпаведнасці з заканадаўствам існуючых праблем.

Рэкамендаваць грамадскім аб’яднанням і іншым арганізацыям далучыцца да названай акцыі.

3. Міністэрству адукацыі да 9 снежня 2015 г. па ўзгадненні з зацікаўленымі:

зацвердзіць графік правядзення навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» і давесці яго да ведама зацікаўленых;

пры неабходнасці ўносіць змяненні ў названы графік.

4. Правесці ў рамках навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» 24 снежня 2015 г. у г. Мінску на базе дзяржаўнай установы «Палац Рэспублікі» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дабрачыннае навагодняе свята з уручэннем падарункаў дзецям ва ўзросце 8–14 гадоў з ліку:

дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, выхаванцаў дзіцячых інтэрнатных устаноў;

дзяцей-інвалідаў;

дзяцей з мнагадзетных і малазабяспечаных сем’яў, сем’яў бежанцаў;

дзяцей з сем’яў ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога саставу Следчага камітэта, органаў унутраных спраў і фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, якія загінулі (памерлі) або сталі інвалідамі пры выкананні абавязкаў воінскай службы (службовых абавязкаў), з сем’яў работнікаў, што абслугоўвалі воінскія кантынгенты ў Афганістане або іншых дзяржавах, на тэрыторыі якіх вяліся баявыя дзеянні, якія загінулі (памерлі) або сталі інвалідамі ў перыяд вядзення баявых дзеянняў;

дзяцей, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

навучэнцаў кадэцкіх вучылішч;

навучэнцаў, якія ўзнагароджаны па выніках раённых, абласных (Мінскай гарадской), рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў;

навучэнцаў, якія маюць поспехі ў грамадскай рабоце.

Устанавіць, што ў дабрачынным навагоднім свяце ў г. Мінску прымаюць удзел ад Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей па 100 дзяцей ад кожнай, ад Мінскай вобласці – 300 і г. Мінска – 1570 дзяцей, у тым ліку навучэнцы Рыжскай беларускай школы (Латвійская Рэспубліка) і Беларускай сярэдняй школы імя Францыска Скарыны г. Вільнюса (Літоўская Рэспубліка), у адпаведнасці са спісамі, якія ўзгадняюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

На дабрачыннае навагодняе свята прадугледжваюцца ў якасці рэзерву 30 падарункаў і 251 білет без падарунка для асоб, якія суправаджаюць групы дзяцей, а таксама прадстаўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і грамадскіх аб’яднанняў.

5. Рэкамендаваць аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму правесці дабрачынныя навагоднія святы для дзяцей 26–30 снежня 2015 г. з удзелам кіраўніцтва аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама ў абласных цэнтрах і г. Мінску, а таксама ва ўсіх гарадах і раёнах краіны ў час школьных канікулаў з удзелам кіраўніцтва гарадоў і раёнаў.

6. Стварыць арганізацыйны камітэт па правядзенні 24 снежня 2015 г. у г. Мінску дабрачыннага навагодняга свята для дзяцей у складзе згодна з дадаткам.

Дадзенаму арганізацыйнаму камітэту вызначыць расходы на арганізацыю і правядзенне дабрачыннага навагодняга свята.

7. Аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму забяспечыць дастаўку дзіцячых дэлегацый на дабрачыннае навагодняе свята і назад.

Мінскаму гарвыканкаму арганізаваць пры неабходнасці пражыванне, харчаванне і культурную праграму для дзіцячых дэлегацый абласцей.

8. Фінансаванне расходаў на правядзенне навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ажыццявіць за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання на цэнтралізаваныя мерапрыемствы, а таксама пазабюджэтных сродкаў і эканоміі каштарыса расходаў.

Рэкамендаваць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам ажыццяўляць фінансаванне названага мерапрыемства за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, пазабюджэтных асігнаванняў і сродкаў з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам.

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **А.Кабякоў**

Дадатак
да пастановы
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
31.10.2015 № 913

**Склад арганізацыйнага камітэта па правядзенні 24 снежня 2015 г. у г. Мінску дабрачыннага навагодняга свята для дзяцей**

| | | |
|---|---|---|
| Качанава<br>Наталля Іванаўна | – | Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (старшыня арганізацыйнага камітэта) |
| Жураўкоў<br>Міхаіл Анатольевіч | – | Міністр адукацыі (намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта) |
| Ананіч<br>Лілія Станіславаўна | – | Міністр інфармацыі |
| Волкаў<br>Пётр Андрэевіч | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Палац Рэспублікі» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь |
| Драгун<br>Вячаслаў Леанідавіч | – | намеснік Міністра гандлю |
| Дрыга<br>Ірына Уладзіміраўна | – | першы намеснік Міністра культуры |
| Казакоў<br>Кірыл Уладзіміравіч | – | генеральны прадзюсар генеральнага прадзюсарскага цэнтра Беларускага тэлебачання Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі |
| Карпенка<br>Ігар Васільевіч | – | намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама |
| Мельчанка<br>Мікалай Аляксандравіч | – | намеснік Міністра ўнутраных спраў – начальнік міліцыі грамадскай бяспекі |

| | | |
|---|---|---|
| Піневіч<br>Дзмітрый Леанідавіч | – | першы намеснік Міністра аховы здароўя |
| Пяткевіч<br>Іосіф Еўстаф'евіч | – | начальнік упраўлення адукацыі і сацыяльна-культурнай сферы Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь |
| Рафальскі<br>Уладзімір Мікалаевіч | – | начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях |
| Саротнік<br>Марыя Аляксандраўна | – | начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі |
| Селіверстаў<br>Юрый Міхайлавіч | – | намеснік Міністра фінансаў |
| Якжык<br>Віктар Віктаравіч | – | намеснік Міністра адукацыі |